шего рода (акты оценивания) и видового отличия (вкусовое оценивание). Короче говоря, эстетика – это философская наука об актах вкусового оценивания (чего бы то ни было).

ЛИТЕРАТУРА


1. История эстетики. Памятники мировой эстетической мысли. Т. 2. – М.: Искусство, 1964. – 835 с.
2. Кант И. Сочинения в 6 т. Т. 3. – М.: Мысль, 1964. – 799 с.
3. Кант И. Сочинения в 6 т. Т. 5. – М.: Мысль, 1966. – 564 с.


## ПРАГРАМА БАЛЬШАВІКОЎ ПА НАЦЫЯНАЛЬНАМУ ПЫТАННЮ Ў 1917–1919 гг.


**А.Л. Дзядзінкін**
*Віцебск, ВДУ*


Партыя бальшавікоў у гады першай сусветнай вайны абвсясціла даволі дэмакратычны курс у справе вырашэння нацыянальнага пытання. Праграма партыі па нацыянальна-дзяржаўнаму будаўніцтву знайшла сваё адлюстраванне ў першых дакументах савецкай улады. Так, “Дэкларацыя правоў народаў Расіі” (2.11.1917 г.) гарантавала “равенство и суверенность народов России”, “право наций на свободное самоопределение вплоть до отделения и образования самостоятельного государства” [1, с. 35]. “Дэкларацыя правоў працоўнага і эксплуатуемага народа” (12.01.1918 г.) устанаўлівала, што “Российская республика учреждается на основе союза свободных наций как федерация советских национальных республик” [1, с. 198]. Абвяшчаючы права народаў на самавызначэнне ў якасці асноўнага лозунга праграмы партыі па нацыянальна-дзяржаўнаму будаўніцтву, бальшавікі імкнуліся да папулярызацыі партыйнай лініі ў нацыянальны рэгіёнах дзяржавы і хацелі прыпыніць далейшую актывізацыю так званых “буржуазных” нацыянальна-вызваленчых рухаў. Сапраўды, з канца 1917 г. на ўскраінах Расіі пачалі ўзнікаць новыя дзяржаўныя ўтварэнні і мясцовыя ўрады, якія прэтэндавалі на незалежнасць. Рэвалюцыянізаваць новаўтварэнні бальшавікі меркавалі пад лозунгамі іх самавызначэння ў савецкай форме. Ужо на III з’ездзе Саветаў 25 студзеня 1918 г. Расійская рэспубліка была аб’яўлена федэрацыяй савецкіх нацыянальных рэспублік, хаця яны яшчэ не былі нават утвораны. Бальшавікі лічылі, што такая пазіцыя “отнимет возможность у национал-шовинистов рассматривать движения наших частей как оккупацию” [4, с. 234]. Па ацэнцы Г. Зіноўева, “правильная политика партии в национальном вопросе облегчила победу над эсерами, меньшевиками, над Деникиным и Колчаком по крайней мере на пятьдесят процентов” [2, с. 7].

Трэба адзначыць, што бальшавікоў пры гэтым не засмучаў той факт, што ў выпадку паслядоўнай рэалізацыі прынцыпаў “Дэкларацыі правоў працоўнага і эксплуатуемага народа” раўнапраўных суб’ектаў федэрацыі будзе столькі ж, колькі суверэнных народаў з’явіцца ў краіне. Найбольш істотным для партыі, якая імкнулася ажыццявіць сусветную рэвалюцыю, было тое, што такім чынам федэрацыя прыстасоўвалася для пашырэння яе да сусветных маштабаў. Наконт гэтага ў Канстытуцыі 1918 года гаварылася, што асноўнай задачай РСФСР з’яўляецца “установление социалистической организации общества и победы социализма во всех странах” [6, с. 45].

Рэпазіторый ВДУ

Ажыццяўленне праграмы бальшавікоў у галіне нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі мела пэўныя адметнасці.

Найбольш складанай з’яўлялася праблема стварэння беларускай дзяржавы. Сітуацыя абвастралася тым, што ў рашэнні гэтай задачы адначасова прымалі ўдзел некалькі палітычных сіл: 1) нацыянальныя партыі, якія групаваліся вакол Вялікай Беларускай Рады; 2) цэнтральныя партыйныя і савецкія органы ўлады – ЦК РКП(б), ЦВК РСФСР і Народны камісарыят па справах нацыянальнасцей; 3) кіраўніцтва Заходняй вобласці і фронту – СНК і Аблвыканкамзах; 4) Беларускі абласны камітэт. У першую чаргу супярэчнасці ўзніклі паміж Аблвыканкамзахам, дзеячы якога не лічылі беларусаў за нацыю, выступаючы за захаванне абласной сістэмы і Вялікай беларускай радай (ВБР), якая не прызнала ўладу бальшавікоў на Беларусі. Кіраўнікі беларускага нацыянальнага руху, выкарыстаўшы абвешчанае бальшавікамі права нацый на самавызначэнне, лічылі нацыянальнае адраджэнне Беларусі галоўным у сваёй праграме. Аднак, разлічваць на падтрымку шырокіх слаёў беларускага грамадства для нацыянальных партый увосень 1917 г. было практычна нерэальна. Аб іх удзельнай вазе ў палітычным жыцці Беларусі сведчыў той факт, што на выбарах ва Устаноўчы сход самая ўплывовая нацыянальная партыя – Беларуская сацыялістычная грамада – набрала толькі 0,3% галасоў выбаршчыкаў. У такім выпадку ВБР у якасці сацыяльнай базы не магла разглядаць рабочых, салдат і сялян, абапіраючыся пераважна на інтэлігенцыю і прадстаўнікоў губернскіх, павятовых і валасных земстваў. Для рэалізацыі ідэі самавызначэння Беларусі Вялікая беларуская рада вырашыла склікаць 5 снежня 1917 г. Усебеларускі з’езд у Рагачове, на якім павінна была быць абрана краявая ўлада [3, с. 17].

Адначасова з захадамі па скліканню з’езда Вялікай беларускай радай у гэтым жа накірунку працаваў і Беларускі абласны камітэт (БАК), які быў створаны з дэлегатаў ад беларускіх губерняў на І Усерасійскім з’ездзе сялянскіх дэпутатаў у лістападзе 1917 г. Лідэры БАКа (правыя эсэры) у гэтым плане разлічвалі на падтрымку рабочых, салдат і сялян, таму яны дэманстравалі лаяльныя адносіны да савецкай улады і заяўлялі, што з’езд павінны садзейнічаць яе ўмацаванню на тэрыторыі Беларусі. Менавіта БАК падаў хадайніцтва ў Наркамнац РСФСР аб правядзенні Усебеларускага з’езда для вырашэння пытання аб самавызначэнні Беларусі.

Кіраўніцтва Наркамнаца РСФСР, даўшы дазвол на правядзенне з’езда, ставіла галоўнай мэтай паралізаваць намеры ВБР дабіцца аддзялення Беларусі ад Расіі. Такім чынам, бальшавікі хацелі стварыць савецкую альтэрнатыву так званаму “буржуазнаму” нацыянальнаму блоку. Сапраўды, у сваім “Звароце да беларускага народа” Беларускі абласны камітэт у процівагу палітычным ідэалам ВБР аб незалежнай Беларусі выступіў з ініцыятывай утварыць аўтаномную Беларусь у складзе Расійскай Федэрацыі [3, с. 21].

Атрымаўшы дазвол і сродкі ад СНК РСФСР на правядзенне з’езда, кіраўніцтва БАК пачало перагаворы з лідэрамі ВБР аб часе яго склікання. У выніку адпаведнай дамоўленасці з’езд пачаў сваю работу 15 снежня 1917 года ў Мінску. На з’ездзе прысутнічалі 1872 дэлегаты ад розных палітычных партый і арганізацый: члены ВБР, прадстаўнікі Беларускіх выканкамаў фронтаў, БАКа, губернскіх земстваў, сялянскіх Саветаў, тут жа былі прадстаўлены бальшавікі і левыя эсэры. Удзельнікі з’езда, прызнаючы савецкую ўладу ў цэнтры, прынялі рашэнне пазбавіць Аблвыканкамзах і СНК Заходняй вобласці і фронту ўладных паўнамоцтваў і ўтварыць новы, непадпарадкаваны бальшавікам, орган улады на Беларусі – Усебеларускі Савет сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў [3, с.



Рэпазіторый ВГУ

23]. У такім выпадку зразумелым становіцца рашэнне СНК аб роспуску з'езда. Бальшавікоў на дадзеным этапе мог задаволіць толькі варыянт стварэння савецкай нацыянальнай дзяржавы, а ў выпадку перахопу ініцыятывы "буржуазнымі" сіламі партыйныя органы адносна іх прымянілі тактыку фізічнай расправы.

Такім чынам, першая спроба стварэння беларускай нацыянальнай дзяржавы не была рэалізавана, бальшавікі разглядалі нацыянальны фактар як другасны ў класавай рэвалюцыйнай барацьбе, таму і непаслядоўна на практыцы рэалізоўвалі прынцып нацыянальнага самавызначэння прыгнечаных народаў.

Другая спроба стварэння беларускай савецкай дзяржавы адбылася ўжо напрыканцы 1918 года, пасля таго, як прадстаўнікамі беларускага нацыянальнага руху была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка.

Ідэю стварэння Беларускай савецкай дзяржавы на гэтым этапе актыўна падтрымлівалі беларускія палітычныя партыі і арганізацыі, якія стаялі на савецкай платформе. Яны выступалі за ўтварэнне аўтаномнай Беларусі ў складзе РСФСР. Аб гэтым было заяўлена на Усерасійскім з'ездзе бежанцаў (Масква, ліпень 1918 г.), на Першай канферэнцыі беларускіх савецкіх партый і арганізацый (Петраград, ліпень 1918 г.), Усерасійскай канферэнцыі беларускіх секцый РКП(б) (Масква, снежань 1918 г.). Тое ж самае прапанавалі абмеркаваць прадстаўнікі Белнацкама на III з'ездзе Саветаў Заходняй вобласці. Аднак, кіраўніцтва Аблвыканкамзаха і СНК Заходняй камуны па-ранейшаму не патрымлівалі ідэю аб стварэнні БССР, разглядаючы вобласць як неад'емную частку Расіі. Пазіцыю Аблвыканкамзаха заняла і Адміністрацыйная камісія УЦВК РСФСР, якая ў пачатку снежня 1918 г. прыняла праект пастановы "Об областных объединениях", адпаведна якому меркавалася захаваць Заходнюю вобласць у складзе Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай і Смаленскай губерній. Атрымаўшы афіцыйную падтрымку Масквы, А.Мяснікоў даў указанні мясцовым газетам не друкаваць матэрыялы аб "белорусской республиканской химере" [5, с. 72].

Канчаткова справа была вырашана толькі пасля таго як, відавочна, пад уплывам У.Леніна 24 снежня 1918 г. ЦК РКП(б) прыняў рашэнне абвясціць незалежную БССР. На такі кардынальны перагляд пазіцый па "беларускаму" пытанню (не аўтаномія, а незалежнасць) цэнтральныя органы ўлады пайшлі пад уплывам унутры- знешнепалітычных фактараў.

Па-першае, па-ранейшаму захоўвалася неабходнасць стварыць савецкую альтэрнатыву "буржуазнаму" руху. Тым больш гэтая задача актуалізавалася ў сувязі са спробамі Рады БНР дабіцца прызнання на міжнароднай арэне. Бальшавікі не хацелі даваць повад "прадстаўнікам варожага капіталістычнага свету" расцэньваць нацыянальную палітыку партыі як шавіністычную ў адносінах да нацыянальных меншасцяў.

Па-другое, праводзячы дэмакратычныя пераўтварэнні ў Расіі, бальшавікі ставілі задачу ўзняць аўтарытэт Камуністычнай партыі ў асяроддзі заходнееўрапейскага пралетарыяту, які разглядаўся як рухаючая сіла сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Па-трэцяе, у сувязі з абвастрэннем адносін паміж РСФСР і Польшчай і абвяшчэннем савецкіх рэспублік у Прабалтыцы і на Украіне партыйныя органы ўлады не маглі не вырашыць праблему беларускага рэгіёна, дзе да гэтага часу існавала Заходняя камуна. Утварэнне Беларускай рэспублікі павінна было завяршыць фарміраванне буфернай зоны на заходніх межах Савецкай Расіі.

Пасля таго як ЦК РКП(б) прыняў адпаведнае рашэнне наконт стварэння Беларускай рэспублікі, 27 снежня 1918 года Наркамнац выдаў пастанову "Аб практычных мерапрыемствах па ўтварэнню БССР". Нарэшце, 30.12.1918 г. на VI Паўночна-

Рэпазіторый ВДУ

Заходняй канферэнцыі РКП(б) была прынята рэзалюцыя аб абвяшчэнні самастойнай “социалистической республики Белоруссии из территорий Минской, Гродненской, Витебской, Могилёвской и Смоленской губерний”.

Заўважым, што рашэнне VI Паўночна-Заходняй канферэнцыі РКП(б) аб утварэнні Беларускай рэспублікі супала з падачай афіцыйнай заявы Польскага міністэрства замежных спраў ураду РСФСР аб тэрытарыяльных прэтэнзіях. Гэта з’яўляецца важным аргументам на карысць таго, што стварэнне БССР ва ўмовах канца 1918 г. было, сапраўды, прадыктавана ў большай меры знешнепалітычнымі прычынамі. У такім выпадку заканамерным будзе з’яўляцца рашэнне ЦК РКП(б) ад 16.01.1919 г. аб вылучэнні са складу БССР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерній і далучэнні гэтых тэрыторый да РСФСР. Як бачна, цэнтральныя органы ўлады не бачылі сэнсу ў тым, каб пакідаць у складзе буфернай дзяржавы губерні, якія не прымыкаюць непасрэдна да дзяржаўнай мяжы.

Мэтамі умацавання буфернага блоку на савецка-польскім памежжы было прадыктавана рашэнне партыі аб аб’яднанні савецкіх рэспублік Беларусі і Літвы ў ЛітБелССР. У выніку 3 лютага 1919 г. на I Усебеларускім з’ездзе Саветаў, а 17 лютага 1919 г. на I з’ездзе Саветаў Літвы былі прыняты адпаведныя дэкларацыі, пасля чаго 27 лютага 1919 г. адбылося афіцыйнае аб’яднанне дзвюх савецкіх рэспублік. З гэтага часу БССР як самастойная дзяржава юрыдычна перастала існаваць, ды і ЛітБелССР, акупіраваная польскімі войскамі, ужо з лета 1919 г. з’яўлялася хутчэй фармальным утварэннем.

Пасля вызвалення Беларусі ад польскіх інтэрвентаў 31 ліпеня 1920 года адбылося паўторнае абвяшчэнне БССР. Як бачна, курс бальшавікоў, накіраваны на стварэнне ў нацыянальных рэгіёнах Расіі савецкіх дзяржаў, на момант завяршэння грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі заставаўся нязменным. Адначасова паміж савецкімі рэспублікамі заключаліся ваенна-палітычныя і эканамічныя пагадненні, праводзілася падрыхтоўчая работа па стварэнню саюзнай дзяржавы.

Такім чынам, “дыялектыка” Леніна па нацыянальна-дзяржаўнаму пытанню ў часы першай сусветнай была заклікана дагадзіць як нацыянальным памкненням у барацьбе за незалежнасць, так і камуністычным мэтам інтэграцыі. На дадзеным этапе бальшавікі вырашылі стварыць у якасці пераходнай формы да цэнтралізаванай дзяржавы “незалежныя” ў савецкім (але не партыйным) плане нацыянальныя рэспублікі.

ЛІТАРАТУРА

1. Декреты Советской власти / Ред. Комиссия: Г.Д.Обичкин и др. Т. 1. – М.: Госполитиздат, 1957. – 625 с.
2. Зиновьев Г.И. Ленин и национальный вопрос // В.И. Ленин. О карикатуре на марксизм и об империалистическом экономизме. – Л.: Госитиздат, 1925. – 312 с.
3. Круталевич В. На путях национального самоопределения: БНР – БССР – РБ. – Мн.: Право и экономика, 1995. – 139 с.
4. Ленин В.И. Полное собрание сочинений. – 5-е изд. – Т. 37. – М.: Политиздат, 1974. – 406 с.
5. Пичуков В.П., Старовойтов М.И. Гомельщина многонациональная. – Гомель: Изд-во Гомельского гос. ун-та, 1999. – 233 с.
6. Советские Конституции. Справочник. – М.: Политиздат, 1963. – 128 с.



Репозиторий ВГУ